ISSN 0203-2031

Ч-2002

# Адукацыя і Выхаванне

У НУМАРЫ

Дзіцячыя рэабілітацыйна-аздараўленчыя цэнтры: аздараўленне, навучанне і выхаванне

Дзелавыя гульні ў навучанні студэнтаў

Фальклор як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці

4

2002

**В.С.Болбас,**
*кандыдат педагагічных навук,*
*прарэктар па вучэбнай рабоце Мазырскага дзяржаўнага*
*педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай,*
**І.С.Сычова,**
*саіскальнік кафедры педагогікі*

# ПАПУЛЯРЫЗАТАР ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНЫХ ІДЭЙ АНТЫЧНАСЦІ НА БЕЛАРУСІ

***Спадчына старажытнай Элады валодае неадольнай прыцягальнасцю для прадстаўнікоў розных культур і народаў. Героі «Іліяды» і «Адысеі», легендарная Троя і нязломная Спарта сталі неад'емнай часткай духоўнага свету кожнага адукаванага чалавека. І калі справядлівае сцвярджэнне, што ўсе дарогі вядуць у Рым, то далучэнне да антычнай культуры — гэта дарога, ідучы па якой, мы набліжаемся да разумення свайго ўнутранага свету, спасцігаем маральныя законы і па-новаму, на вышэйшым узроўні, вучымся любіць родную зямлю, ганарыцца справамі продкаў.***

Многія ідэі антычнай літаратуры, філасофіі, педагагічнай думкі здзіўляюць даступнасцю і дальнабачнасцю, цэласнасцю ўспрыняцця і сілай інтэлекту. Падобна люстэрку, яны непрадузята высвечваюць набыткі і пралікі тэхнакратычнага веку, вуснамі старажытных мудрацоў даюць адказы на самыя складаныя пытанні рэчаіснасці і навуковага пазнання.

Каштоўнасць дасягненняў антычнасці для маральнага ўдасканалення кожнага чалавека і фарміравання гуманнага грамадства глыбока разумелі і нашы папярэднікі — мысліцелі сярэдневяковай Беларусі, якія ніколі не стаялі на ўзбочцы духоўных пошукаў чалавецтва. Сярод іх асабліва вылучаецца постаць Беняша Буднага — асветніка-гуманіста, пісьменніка, перакладчыка і каментатара антычных аўтараў, які ўнёс неацэнны ўклад у развіццё духоўнай культуры Бацькаўшчыны, але, на жаль, застаўся малавядомым для нашчадкаў.

Біяграфічныя звесткі пра Б.Буднага даволі скупыя. Не ўстаноўлены асноўныя даты яго жыцця і дзейнасці. Вядома, што жыў вучоны на рубяжы XVI—XVII стст. Нарадзіўся, магчыма, у мястэчку Лоск (цяпер вёска ў Валожынскім раёне Мінскай вобласці) або на Віленшчыне. Даследчыкі схільныя лічыць Б.Буднага сынам або братам вядомага культурна-рэлігійнага дзеяча Сымона Буднага, які першым распачаў кнігадрукаванне на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Верагодна, што Беняш Будны атрымаў адукацыю ў адной з пратэстанцкіх навучальных устаноў. Мажліва, у Лоскай арыянскай школе. Тут вывучалі лацінскую, грэчаскую, старажытнаяўрэйскую мовы, а таксама філасофію, рыторыку, права, тэорыю музыкі, медыцыну, гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства,

матэматыку, фізіку, этыку. Выкладалася філасофія Арыстоцеля. Для граматычных практыкаванняў і ў выхаваўчых мэтах шырока выкарыстоўваліся творы антычных аўтараў. Вучняў прывучалі да самастойнага мыслення, выхоўвалі ў духу гуманізму, павагі да культур розных народаў. Гэта садзейнічала ўсталяванню на беларускіх землях заходняй педагагічна-выхаваўчай традыцыі, якая зарадзілася ў антычнасці. Шырыня кругагляду, высокі ўзровень выкладання і якасць падручнікаў дазвалялі выпускнікам пратэстанцкіх навучальных устаноў працягваць вучобу ў заходнееўрапейскіх універсітэтах. Беняш Будны скончыў Кёнігсбергскі пратэстанцкі універсітэт, дзе ў 1588 г. запісаўся як «Веніямін Будны, родам з Літвы» [1, с. 186].

Адукаваны «ліцвін» служыў потым пры магнацкіх дварах Яна Кішкі, Фёдара Скуміна і Адама Храптовіча, быў аканомам у Мікалая Крыштофа Радзівіла. Сваім мецэнатам Б.Будны прысвяціў кнігі, вершаваныя творы, узвялічыўшы іх імёны і высакародныя справы ў імя распаўсюджання кніг і асветы. Пісьменнік мог карыстацца багатымі бібліятэкамі сваіх апекуноў. Даследчыкі адзначаюць, што іх мелі князі Слуцкія, Радзівілы, паны Зяновічы, Хадкевічы, асветнікі Сымон Будны, Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, Мялецій Сматрыцкі, Саламон Рысінскі. Сапраўдныя кніжныя багацці старадрукаў, заходнееўрапейскіх і мясцовых выданняў былі сабраны на беларускіх землях у бібліятэках царкоўных, манастырскіх, школьных, ордэнскіх, каля 40 тысяч тамоў налічвалася ў бібліятэцы Полацкага езуіцкага калегіума.

Адукаваныя людзі цытавалі антычных аўтараў у асабістай перапісцы, арыгінальных творах. На Беларусі ў XVI—XVII стст. чыталі свецкія аповесці «Троя», «Александрыя», раман Геліядора «Эфіопіка», ведалі змест «Іліяды» і «Адысеі». Шырокае распаўсюджанне атрымалі зборнікі «Пчала», «Ізмарагд», што ўключалі ўрыўкі з твораў Дэмакрыта, Платона, Герадота, Сафокла і інш. Карысталіся папулярнасцю трактат «Тайна тайных, або Арыстоцелевы врата», «Мудраслоўі» Менандра. Добра знаёма было тагачасным аматарам кнігі імя Марка Тулія Цыцэрона. Яго спадчына вывучалася ва універсітэтах, лічылася крыніцай мудрасці і адукаванасці. Перадавым людзям эпохі Адраджэння былі блізкія ідэі антычнага мысліцеля: вера ў чалавека і магчымасці яго розуму, пераўтваральную сілу асветы і мастацтва, неабходнасць гістарычных ведаў. Да распаўсюджання яго твораў мае прамое дачыненне і Беняш Будны. Ён пераклаў і выдаў трактаты Цыцэрона «Пра старасць» (1595, 1603) і «Пра дружбу» (1603, 1606), якія стварылі падмурак для развіцця ўласнага светапогляду мысліцеля, фарміравання гуманістычных маральных ідэалаў на нацыянальнай глебе.

Але найбольшую вядомасць Б.Буднаму прынесла кніга «Кароткія і ясныя аповесці, якія па-грэчаску называюцца Апафегматамі», упершыню выдадзеная ў 1599 г. у Вільні на польскай мове. У прадмове і каментарыях да філасофска-этычных сентэнцый пісьменнік праявіў сваю багатую індывідуальнасць, здольнасць бачыць трагічнае і камічнае ў жыцці, выкрываць грамадскія і асабістыя заганы, усебакова, з дапамогай гістарычных паралелей, гумару, сатыры і абстрактнага мыслення аналізаваць з'явы рэчаіснасці.

Даследчыкі лічаць, што першае і другое выданні «Апафегматаў» (1599, 1603) убачылі свет у віленскай друкарні Яна Карцана. У 1614 г. кніга з дапаўненнямі двойчы выдавалася ў Любчы (зараз Навагрудскі раён) у друкарні П.Б.Кміты. Потым 6 разоў выходзіла ў Кракаве. У пачатку XVIII ст. па загадзе Пятра I была перакладзена на расійскую мову. Тры выданні з'явіліся ў Маскве і пяць — у Пецярбургу. Урыўкі з «Апафегматаў» былі ўключаны ў зборнікі і хрэстаматыі вядомых расійскіх вучоных Ф.Буслаева, М.Чулкова, А.Курганава, што сведчыць аб значнасці выказаных ідэй, таленце беларускага асветніка і неабходнасці літаратуры такога характару для навучання і выхавання моладзі. І ў наш час складальнікі зборнікаў афарызмаў карыстаюцца працай Б.Буднага, якая не страціла актуальнасці, філасофска-пазнавальнай і павучальна-педагагічнай каштоўнасці і вымушае па-іншаму глядзець не толькі на культуру старажытнасці, але і на навукова-асветніцкі патэнцыял беларускага народа і яго лепшых прадстаўнікоў.

Значная роля ў выданні «Апафегматаў» належыць кнігавыдаўцу Яну Карцану, якога даследчыкі называюць прадаўжальнікам справы Ф.Скарыны, а таксама параўноўваюць з венецыянскім друкаром Альдам Мануцыем. У Вільні на той час

працавала 15 друкарань, але выданні Я.Карцана вызначаліся высокай паліграфічнай культурай, якасцю афармлення і шрыфтоў, адзінствам зместу і формы. У віленскай друкарні было выдадзена каля 100 кніг на лацінскай, грэчаскай, польскай мовах. Сярод іх творы Цыцэрона, «Гісторыя Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія, «Сентэнцыі» вядомага айчыннага педагога Яна Ліцынія Намыслоўскага, а таксама падручнікі старажытнагрэчаскай мовы, напісаныя мясцовымі аўтарамі, медыцынскія даведнікі, календары і інш. З Я.Карцанам супрацоўнічалі С.Будны, А.Рымша, А.Волан, А.Захарэўскі. Іх вызначала павага да антычнай літаратуры, гуманізм, свецкі кірунак думак, імкненне не замыкацца ў вузкарэлігійных пытаннях, а далучаць чытача да агульначалавечых каштоўнасцей.

Заканамерным працягам такой накіраванасці стала выданне «Апафегматаў» — літаратурнай апрацоўкі твораў Плутарха, Дыягена, Цыцэрона, своеасаблівай анталогіі антычнай навукі і мудрасці, якая знайшла пісьмовае ўвасабленне і пераасэнсаванне ў часе і прасторы, узбагаціўшы культуру славянскіх народаў. Б.Будны клапаціўся пра духоўны свет суайчыннікаў, бачыў мэту выдання ў тым, каб да скарбаў сусветнай думкі далучыліся тыя, хто не ведае латыні. Сродкам, мастком да гэтага для мясцовага люду не выпадкова стала польская мова, якая ў той час узяла на сябе функцыі мовы міжнацыянальных зносін у Вялікім княстве Літоўскім, паступова займала пануючае становішча на дзяржаўным узроўні, у сферы адукацыі, кнігадрукавання. Гэта таксама стала адной з прычын таго, што набыткі айчыннай педагогікі і філасофіі выхавання раскіданы ў славянскім свеце, схаваны пад вопраткай розных моў і рэлігій, маладаступныя масаваму чытачу. Між тым гэта спадчына патрабуе пільнага аналізу і вывучэння, бо мае глыбокія карані ў нацыянальным менталітэце і здольная ўзбагаціць сучасную сістэму выхавання падрастаючых пакаленняў.

Свае погляды на прызначэнне кнігі, асветы ў жыцці чалавека Б.Будны выказаў у «Прадмове да чытача», напісанай да віленскага выдання «Апафегматаў». Яна заканчваецца словамі Саламона: «Слухаючы мудрых, сам мудры будзеш» [2, с. 248]. Чытачам, якія прыслухаюцца да гэтай парады і будуць кіравацца ёю ў самаадукацыі і маральным удасканаленні, і адрасуе асветнік сваю працу. Гучыць услаўленне чалавечага розуму, вера ў тое, што веды можна спасцігнуць праз кнігу, праз настаўніка. Б.Будны адзначае, што кніг выдаецца шмат, але нярэдка яны прысвечаны рэчам прыватным, малазначным для інтэлектуальнага развіцця. Памяць і вочы тады хутка стамляюцца, і чытач губляе ахвоту да кнігі. Таму аўтар «Прадмовы» мае намер ісці за Гарацыем і прапаноўваць такія кнігі, «...якія, малымі будучы, вялікі сэнс у сабе тояць» [2, с. 248]. Як педагог ён бачыць эфектыўнасць развіццёвага ўздзеяння не ў загрувашчанасці фактамі, а ў выкарыстанні разнастайных ідэй, лаканічнасці выказванняў. Пісьменніцкім крэда аўтара можна лічыць словы Платона, звернутыя да ўсіх, хто не хоча гаварыць ці пісаць на вецер: «Меру прадмовы вызначае той, хто слухае, а не той, хто гаворыць» [3, с. 6]. Не выпадкова кніга, створаная гэтым патрабавальным да сябе майстрам слова ў форме апавяданняў-мініяцюр, і сённяшняму чытачу не здаецца архаічнай.

Мудрыя думкі, пачэрпнутыя з кніг, Б.Будны раіць выкарыстоўваць у публічных выступленнях і прыватных размовах, прызнаючы неабходнасць асветы ў асабістым і грамадскім жыцці, справе служэння агульнаму дабру. Аўтар «Апафегматаў» падкрэслівае, што, складаючы кнігу, ён меў перад сабой прыклад людзей мінулых вякоў, якія «...такою любоўю да айчыны палалі, што дзеля яе славы не толькі маёмасці не шкадавалі, але і сваё жыццё з вялікай гатоўнасцю за радзіму аддаць былі рады» [4, с. 91]. Уласнае прызначэнне мысліцель бачыць у тым, каб складаць і выдаваць кнігі «для агульнай карысці». Вышэй за іншыя маральныя каштоўнасці ставіць патрыятызм, служэнне айчыне і народу. Але як прадстаўнік новага пакалення інтэлігенцыі, выхаваны ў традыцыях вальнадумства, пратэстанцкага веравызнання, ён бярэ прыклады не ў Бібліі, не ў хрысціянскай гісторыі, а, падобна дзеячам заходнееўрапейскага Адраджэння, звяртаецца да антычнасці. Для Б.Буднага культура старажытнай Грэцыі і Рыма з'яўляецца непераўзыдзеным узорам, а дасягненні ў сферы маралі, педагогікі, уладкаванні грамадства — залатым сячэннем, па якім павінны звяраць свае дзеянні і ідэалы яго сучаснікі і суайчыннікі, а таксама прад-

стаўнікі кіруючых класаў. Асветнік сваёй кнігай закладвае асновы для развіцця свецкай, не залежнай ад царквы, сістэмы адукацыі і выхавання.

Думкі аўтара развівае выдавец Пётр Бластус Кміта, пры непасрэдным удзеле якога друкаваліся свецкая, гістарычная літаратура і дапаможнікі, «Статут Слуцкай школы», зборнік прыказак Саламона Рысінскага і інш. У «Прадмове» да любчанскага выдання «Апафегматаў» ён піша, што, нягледзячы на цікавасць да новага, «...шмат карыснага для навукі і ў павучанне пакінулі нам вучоныя і мудрыя людзі старажытнасці. І кожны высакародны чалавек павінен усё гэта захоўваць і пастаянна вывучаць» [5, с. 38—39]. Выдавец рэкамендуе «Апафегматы» для прадстаўнікоў усіх саслоўяў, бо мудрасць старажытных цывілізацый з'яўляецца універсальнай ісцінай для кожнага чалавека.

У Заходняй Еўропе існавала традыцыя складання зборнікаў, дзе прыводзіліся выпадкі з жыцця славутых людзей, іх выказванні. Літаратуразнаўцам вядомыя падобныя кнігі Эразма Ратэрдамскага і Петраркі. Беларускі асветнік Беняш Будны стаў таленавітым прадаўжальнікам гэтай германеўтычнай традыцыі, адчуўшы запатрабаванні чытачоў, грамадскі настрой. «Апафегматы» ў поўнай рэдакцыі ўключаюць у сябе чатыры часткі, або кнігі, і каля 250 каментарыяў. Першая змяшчае 300 апавяданняў з жыцця 42 філосафаў старажытнай Грэцыі: Сакрата, Платона, Арыстоцеля, Піфагора, Дэмакрыта і г.д. Другая кніга прысвечана палкаводцам і вядомым людзям антычнасці і сярэднявечча. Сярод іх Юлій Цэзар, Аляксандр Македонскі, Ганібал, Пампей і інш. Героі трэцяй кнігі — славутыя спартанцы Леанід, Лісандр, Агіс, іншыя выдатныя прадстаўнікі гэтага самабытнага і гордага народа, гісторыя якога здольная нават у самых чэрствых сэрцах абудзіць патрыятызм і любоў да айчыны. Апошнюю, чацвёртую, кнігу аўтар прысвяціў выдатным жанчынам старажытнасці. Размова ідзе пра маці Аляксандра Македонскага — Алімпію, дачку Арыстоцеля — Піфію, славутую рымлянку Лукрэцыю. Пачынаецца кніга апавяданнем пра Ванду і Ядзвігу — польскіх каралеў.

Увага да спраў прыгожай палавіны чалавецтва, думаецца, з'яўляецца не выпадковай і сведчыць пра даволі высокі сацыяльны і маёмасны статус жанчыны ў сярэдневяковай Беларусі. Асветнік пагаджаецца з думкай Сакрата, што не багацце, а маральныя якасці жанчыны вызначаюць сямейныя ўзаемаадносіны: могуць прывесці да радасці і суцяшэння або, наадварот, да вялікіх пакут. Гэта пацвярджаюць і многія беларускія народныя прыказкі. Напрыклад: «Добрая жонка — вяселле, а ліхая — паганае зелле», што, дарэчы, даказвае агульнасць поглядаў розных народаў на сям'ю. Б.Будны, занепакоены празмерным імкненнем сучаснікаў да раскошы, палічыў патрэбным пазнаёміць чытачоў з мудрым рашэннем спартанскага заканадаўцы Лікурга, які пастанавіў аддаваць дзяўчат замуж без пасагу, каб іх абраннікі беднасцю не пагарджалі і звярталі ўвагу перш за ўсё не на матэрыяльны дабрабыт, а на чысціню нораваў.

Аўтар услаўляе мацярынства і ў якасці ўзору паводзін жанчыны-патрыёткі прапануе самаахвярнасць, здольнасць паставіць грамадскія інтарэсы вышэй за асабістыя. Так, спартанская маці Луцэна, даведаўшыся пра гібель сына ў паходзе, мела мужнасць сказаць: «Для таго я і сына нарадзіла, каб ён не баяўся за сваю айчыну галаву скласці» [3, с. 269]. Гэта думка поўнасцю супадае з пазіцыяй аўтара. Апавядаючы пра падзеі Рымскай гісторыі, ён заўважае: «Трэба больш берагчы здароўе айчыны сваёй, чым уласнае» [3, с. 232].

Справы афінскай дэмакратыі, лепшыя здабыткі грэчаскіх гарадоў-полісаў выклікаюць захапленне беларускага асветніка. І, на яго думку, здольныя быць узорам паляпшэння грамадскага ладу Рэчы Паспалітай. Прыкладам справядлівага кіраўніка з'яўляецца Перыкл, які штораніцы паўтараў сабе: «Памятай, Перакле, што ты вольным народам кіруеш» [3, с. 224]. Такім чынам, роўнасць людзей, дэмакратычны грамадскі лад спрыяюць росквіту індывідуальнасцей, гармоніі ўзаемаадносін людзей. Б.Будны перакананы, што сапраўдны кіраўнік павінен так паводзіць сябе з падданымі, як бацька з дзецьмі: быць і строгім, і літасцівым. Асветнік вызначае наступныя рысы кіраўніка, а значыць, і педагога, выхавацеля: здольнасць кіраваць сабой, самадысцыпліна, добразычлівасць, уменне выслухаць думку і парады іншых, але мець уласнае меркаванне, захоўваць пэўную дыстанцыю з падначаленымі.

У сваіх каментарыях да падзей старажытнай гісторыі Б.Будны востра крытыкаваў метады кіравання і стан нораваў вышэйшых саслоўяў Рэчы Паспалітай. Выкрываў казнакрадства, ліхвярства, празмерна высокія падаткі. Бачыў у гэтым прычыну заняпаду матэрыяльнага і маральнага жыцця народа. У «Апафегматах» прыводзіцца выказванне рымскага кесара Траяна: «Казна, як селязёнка: калі набрыняе, гінуць іншыя члены; таксама, калі казна багацее — жабракамі становяцца падданыя» [3, с.. 186]. Ціберый сцвярджаў: «Добры пастух стрыжэ з авечак воўну, а не абдзірае скуру» [6, с. 180]. Асветнік дасціпна каменціруе гэтыя выказванні, ілюструе выпадкамі з жыцця мясцовых чыноўнікаў, якія не з'яўляюцца прыкладам паводзін для простых людзей. І прыходзіць да высновы: «Не можа быць шчаслівай Рэч Паспалітая, калі ў ёй не паважаюць дабрапрыстойных і не караюць злачынцаў» [3, с. 27]. Б.Будны прыводзіць выказванне Катона аб тым, што агульнае дабро грунтуецца больш на норавах, сумленнасці, выхаванні дабрачыннасці, працалюбстве, чым на знешнім лоску і вайсковым забеспячэнні, і дадае: «У нас пануе сквапнасць, пралюбадзейства, пакланенне багаццю, перайманне невуцтва, змяшэнне дабра і зла» [3, с. 236]. Можна меркаваць, што беларускаму асветніку імпануе пазіцыя стоікаў. Згодна з іх уяўленнямі, у прыродзе і грамадстве пануе адзіны універсальны закон, які робіць усіх людзей грамадзянамі адзінай сусветнай дзяржавы — Касмаполіса. Несправядлівасць, парушэнне раўнавагі ў сферы маралі прыводзяць да крызісу. Аб гэтым у «Апафегматах» гаворыць Салон, нагадваюць Платон, Арыстоцель, Сакрат. «Лепш за ўсё кіруе дзяржавай сумленная сціпласць» [6, с. 180], — сцвярджаў мудрэц Аругеліўс, прыводзячы прыклад падзення Рыма, які патануў у празмернасці, разбэшчанасці нораваў і багацці.

Асветнік бачыць сваю задачу ў тым, каб паказаць кіраўнікам грамадскія заганы, выкрыць іх, і гэтым палепшыць жыццё народа. Ён перакананы, што кнігі могуць на многае раскрыць вочы разумным і справядлівым уладарам, стаць сродкам іх удасканалення на асабістым і дзяржаўным узроўнях. «Кнігі — як люстра: хоць нічога не гавораць, але ж кожнаму чалавеку заганы яго паказваюць» [3, с. 153]. Сваю думку Б.Будны абгрунтоўвае, расказваючы пра цара егіпецкага Пталамея, якому мудрацы раілі больш чытаць: «Тое, пра што не адважваюцца каралям і князям іх прыбліжаныя сказаць, — самі ўбачыце, чытаючы часта кнігі» [3, с. 153]. Асветнік лічыў, што прыходзіць да ўлады павінны людзі, пазбаўленыя сур'ёзных асабістых заган, адукаваныя, здольныя да ўспрыняцця новага, самаўдасканалення, працы над сабой, прыхільнікі кніжнай мудрасці, а не матэрыяльных даброт. Нездарма Б.Будны прыводзіць прыклад з жыцця Аляксандра Македонскага. Калі яму прынеслі каштоўную шкатулку са скарбніцы цара Дарыя, то Аляксандр сказаў: «Мая думка — лепш за ўсё хаваць у ёй кнігі Гамеравы» [3, с. 198]. Праз гэта і іншыя выказванні паказана значэнне пісьменнасці, кнігі для самавыхавання чалавека, а таксама захавання гістарычнай памяці. У старажытнасці разумелі, што самыя праслаўленыя ўладары і іх справы будуць забыты, калі пра іх не раскажуць у кнігах. Аб гэтым пісаў Гарацый, якога часта цытуе Б.Будны, падкрэсліваючы прыярытэт культуры, гуманітарных ведаў у духоўна-маральным удасканаленні грамадства.

Для аргументацыі сваёй думкі асветнік нярэдка выкарыстоўвае сатыру, гумар, высмейвае людзей, якія не цэняць святло навук, не разумеюць іх карысці. Так, Сакрат пра багатага, фанабэрыстага і раскошна апранутага чалавека сказаў: «Вось звычайны конь, у серабро ўвабраны» [2, с. 248]. Б.Будны каменціруе: «Людзі някемлівыя, ускладаючы на сябе кавалкі серабра ці золата, не разумеюць таго, што золата дурному мудрасці не прыдае, роўна як каню сярэбраная амуніцыя ні спрыту, ні рысі прыдаць не можа» [2, с. 248]. Сцвярджаецца асабістая годнасць адукаванага і сумленнага чалавека, якая не залежыць ад знатнасці паходжання, багацця, месца за сталом на званым абедзе. Аўтар зборніка неаднаразова выказвае наконт гэтага ўласнае меркаванне, у якім гучаць ноткі горычы і расчаравання, падкрэслівае, што вучоныя вартыя ўвагі і заслужанай узнагароды, нават калі з-за сціпласці самі аб гэтым не просяць.

Сродкам для паляпшэння нораваў асветнік лічыць веды, якія набываюцца праз цярпенне, настойлівасць. «Кожная навука, — піша ён, — даецца цяжка, аднак, авало-

даўшы ведамі, чалавек можа іх выкарыстоўваць і дзеля ўласнай і дзеля грамадскай карысці» [3, с. 32]. Не выпадкова многія выказванні ў зборніку прысвечаны педагагічным пытанням, мудрасці. Старажытныя філосафы былі перакананы, што ўсё нетрывала ў жыцці: багацце, слава, прыгажосць, здароўе і маладосць. Толькі веды, вынікі выхавання, як добрае віно, з часам мацнеюць і набіраюць сілы, даючы перавагу сталаму і адукаванаму чалавеку над іншымі, бо толькі розум з узростам яснее і толькі яго, у адрозненне ад прыгажосці і здароўя, няздольны адабраць няўмольны час. Серабро і золата страчваюць свой бляск у параўнанні з ведамі, бо могуць быць украдзены, знішчаны ў часе вайны. Веды ж у шчасці — упрыгожанне, а ў горы — суцяшэнне.

Жыццёвы вопыт, час выступаюць як перыяд набыцця ведаў, трэніроўкі пачуццяў і маральных прынцыпаў, своеасаблівай іх крышталізацыі. Так, над Платонам пасмейваліся: да якога часу ён будзе вучыцца? Мудрэц адказаў: «Да той пары, пакуль не буду лічыць залішнім станавіцца разумней і лепш». Б.Будны тлумачыць: «... невук лічыць за сорам вучыцца ў сталым узросце. Філосаф жа ўсё жыццё імкнецца ўдасканальвацца ў навуках і дабрачыннасці» [3, с. 7]. Беларускі асветнік падзяляе адзін з асноўных педагагічных прынцыпаў Платона: аб бесперапыннасці адукацыі і выхавання, неабходнасці іх для людзей усіх узростаў. Асноўная задача выхавання, паводле Платона, заключаецца ў найбольш дакладным устанаўленні прадвызначэння чалавека, дапамозе яму дасягнуць гармоніі з уласнай творчай ідэяй, прыроднымі здольнасцямі. Абапіраючыся на веды, настаўніка, неабходна ў зямным жыцці рэалізаваць свае індывідуальныя магчымасці, каб прынесці карысць грамадству. Гэтыя думкі педагогаў антычнасці, узноўленыя Б.Будным, апераджалі свой час і мелі важнае значэнне для фарміравання педагагічных ідэй на айчынных землях, гуманізацыі выхаваўчага працэсу.

З роляй лекара, вельмі прэстыжнай у антычнасці прафесіі, атаясамліваецца і роля настаўніка-выхавацеля. У «Апафегматах» сцвярджалася: «Медыцына лечыць хваробы цела, а філасофія — недахопы інтэлекту. Таму філосафа карысна слухаць таксама, як і медыка» [3, с. 70]. Настаўніку аддаваўся прыярытэт нават у параўнанні з бацькамі, бо апошнія далі жыццё, а педагогі — здольнасць напоўніць яго зместам, годнымі справамі і дабрачыннасцю. Менавіта так ацаніў ролю Арыстоцеля ў фарміраванні сваёй асобы яго вучань Аляксандр Македонскі. Але гэта прафесія, падобна медыцыне, прадугледжвала і вялікую адказнасць за справы выхаванцаў. Настаўнік мог быць пакараны за ганебныя ўчынкі вучня, пра што расказваецца ў адной з сентэнцый.

Асуджаліся таксама бацькі, якія пашкадавалі сродкаў або па іншых прычынах не паклапаціліся пра адукацыю дзяцей. Платон гаварыў: «Калі бацька не аддасць сына вучыцца добрым норавам, то такі не павінен наследаваць маёнтка» [3, с. 12]. Павучальны змест мае і апавяданне пра філосафа Арыстыпа, які браў 500 драхмаў за навучанне. Бацька здзівіўся такому высокаму кошту і сказаў: «Я б нявольніка за меншую цану мог купіць». Арыстып адказаў: «Купі, калі трэба, будзеш мець дваіх» [3, с. 15]. Такім чынам асвета давала чалавеку духоўную свабоду і права выбару, далучала да грамадскага жыцця, дасягненняў навукі і мастацтва. Нездарма на пытанне аб карысці навучання філосаф даў адказ: «Калі і нічога ад вучэння не атрымае, то ва ўсякім разе не будзе сядзець у тэатры, як камень на камні» [3, с. 17—18].

Ідэалам настаўніка і чалавека для Б.Буднага з'яўляецца Сакрат. Нават метад індукцыі, уласцівы разважанням філосафа, з поспехам бярэ на ўзбраенне беларускі асветнік, калі робіць свае высновы аб лёсе Айчыны і народа на аснове павучальных гістарычных выпадкаў. У сферы адукацыі і выхавання Сакрат унёс свой арыгінальны ўклад. Славутае: «Я ведаю толькі тое, што нічога не ведаю» стала навуковым крэда для ўсіх, хто здольны самастойна мысліць, хоча дабіцца поспехаў у самаадукацыі.

Але найбольш імпануе Б.Буднаму ў вучэнні Сакрата і стоікаў увага да чалавека, яго ўнутранага свету і маральных якасцей. Узброіўшыся маральна-этычнымі ведамі, беларускі асветнік, падобна мудрацам антычнасці, спрабуе ў вялікім мностве людзей знайсці чалавека. Ён верыць у сілу выхавання, здольнасць самаўдасканальвацца з дапамогай ведаў, чытання кніг. Акрамя таго, — у прыроджаную маральнасць людзей, іх схільнасць да дабра. Гэта палажэнне

этыкі Сакрата не аднойчы падвяргалася крытыцы. Але варта адзначыць, што яно мае глыбокія карані ў народнай культуры. У фальклоры прасочваецца думка, што чалавека трэба вучыць, выхоўваць, прывіваць добрыя звычкі, бо прычынай многіх заган з'яўляецца няведанне, адсутнасць трывалых маральных крытэрыяў. Сувязь жа паміж ведамі і паводзінамі ажыццяўляецца праз выхаванне.

Б.Будны прызнае, што чалавек з усімі сваімі недахопамі — самая большая каштоўнасць на зямлі. Падыходзіць да духоўнага свету асобы як да супярэчнасці, дзе адбываецца вечная барацьба дабра і зла. Прыводзіць у прыклад філосафа Дыягена, які спачатку вёў недабрадзейнае жыццё, але паступова розум і прыродныя маральныя якасці дапамаглі яму выправіцца. Б.Будны называе дабрачынным таго, хто з разуменнем адносіцца да недахопаў іншых, не папракае за былыя памылкі, бо яны ўласцівыя кожнаму, розніца — толькі ў іх колькасці. «Трэба не гневацца на людзей, а выпраўляць іх недахопы» [3, с. 117], — лічыць асветнік. Не заўсёды дапамагаюць пропаведзі, угаворы. Досыць дзейсным лічыўся метад пакарання, прычым і ў навучанні, і ў выхаванні. Неабходнасць яго выкарыстання абгрунтоўвалася аналогіяй з ужываннем у медыцыне горкіх лекаў, якія даюць добрыя вынікі. У той жа час асуджалася запальчывасць, пакаранне ў гневе, што недапушчальна для мудраца, педагога. Для вучня ж галоўнае — цярпець, захоўваць здароўе духу і не кідаць пачатую справу. Такім чынам, дапускаючы фізічнае пакаранне, старажытныя мудрацы не абсалютызавалі яго, ашчадна, з разуменнем ставіліся да асобы, прапаноўвалі разнастайныя метады педагагічнага ўздзеяння.

Аўтар «Апафегматаў» перакана期, што дасканалы чалавек, а тым больш калі ён прэтэндуе на ролю выхавацеля, павінен не толькі мець высокі інтэлектуальны ўзровень, але і весці дабрадзейнае жыццё. «Звычайна, — сцвярджае Б.Будны, — натоўп прымае шматслоўнага за мудрага. Аднак мудрасць заснавана на вучонасці і добрых норавах, а не на шматслоўнасці» [5, с. 41]. Асноўныя якасці асветніка: валодаць сродкамі доказнасці, нярэдка ад супрацьлеглага, майстэрствам вядзення дыялога, пераканання, уздзеяння на людзей. Старажытныя мудрацы выкарыстоўвалі для гэтага не толькі правілы рыторыкі, але і нетрадыцыйны падыход; моцнадзеючымі сродкамі лічыліся гумар і сатыра.

Спартанцы, якія славіліся лаканічнасцю ў выказваннях, былі перакананы, што не шматслоўе народ упрыгожвае, а сумленнасць, храбрасць, умеркаванасць. Гэтыя якасці ўхваляліся і народным светапоглядам беларусаў, пра што сведчаць наступныя прыказкі: «Больш слухай, менш гавары», «Слоў на мех — спраў на смех» і г.д. У зборніку сустракаем шмат выказванняў, дзе даюцца парады асцярожна адносіцца да сказанага слова, асабліва неадабральнага, пазбягаць плётак і нагавораў, каб «языком розуму не пераўзыходзіць» [3, с. 136]. Да вучняў, моладзі ў першую чаргу, звернута і такое папярэджанне: «Свае вушы не кожнаму давярай» [3, с. 162]. Сёння, калі людзей літаральна захлiснуў паток інфармацыі, разнастайнай друкаванай і відэапрадукцыі, яно гучыць асабліва злабадзённа, бо і ў выбары субяседніка, кніг неабходная прадбачлівасць. Не засталася па-за ўвагай асветніка і такая балючая ва ўсе часы праблема, як брыдкаслоўе. Піфагор, убачыўшы чалавека добра апранутага, які гаварыў непатрэбнае, заўважыў яму: «Або гавары адпаведна сваёй вопратцы, або апраніся адпаведна сваім размовам і нораву» [3, с. 125]. Б.Будны таксама заўважае, што добразычлівасць, правільныя паводзіны здольныя зрабіць нават непрыгожага чалавека больш прывабным.

У кнізе асуджаюцца легкадумнасць, прага да асалод, п'янства і нежаданне сур'ёзна адносіцца да вырашэння жыццёвых праблем. Паводле этыкі стоікаў, высокія маральныя якасці, дасягненні асабістага шчасця ў многім грунтуюцца на пачуцці меры, цярпенні, перамозе над сваімі страсцямі-афектамі.

З паняццем меры цесна звязана і разуменне антычнымі мудрацамі маральнай і інтэлектуальнай свабоды, глыбока ўспрынятае беларускім асветнікам, вызначальнае для яго філасофска-педагагічных развагаў. Свабодны чалавек — гэта арыстакрат духу, які не прыніжаецца перад сілай, багаццем і знатнасцю, не баіцца смерці. Свабода дасягаецца праз далучэнне да ведаў, самаўдасканаленне. Дабрадзейнасць бачыцца не ў сляпым падпарадкаванні пісаным, дзяржаўным, законам, а ў асабістых перакананнях, унутраным мараль-

ным стрыжні. Пераказвае ён такі павучальны выпадак. Многія лічылі «шчаслівым філосафа Калісфена, які карыстаўся міласцю Аляксандра. Дыяген жа гаварыў пра яго: наадварот, ён жабрак, бо вымушаны абедаць і вячэраць, калі гэтага пажадае цар. «Лепш жыць у беднасці, але на волі, чым у багатай няволі» [5, с. 45], — робіць вывад Б.Будны. Вуснамі старажытных, на іх прыкладзе, ён дае ўрок маральнасці сваім суайчыннікам, многія з якіх апусціліся і пагразлі ў заганах.

Асветнік падкрэслівае важнасць незалежнай думкі, самапавагі для ўдасканалення асобы, бо, толькі ўсведамляючы ўласную годнасць, чалавек можа разлічваць на павагу іншых. Гэта ж датычыцца і адносін паміж народамі, што ва ўсе часы мела для беларусаў немалаважнае значэнне. Адсутнасць або нізкі ўзровень нацыянальнай і чалавечай годнасці вядзе да дэфармацыі асобы і ў цэлым разбуральна, адмоўна ўздзейнічае на фарміраванне менталітэту нацыі.

Ідэалам чалавечых узаемаадносін для Б.Буднага з'яўляецца дружба, дзе якраз і праяўляецца найвышэйшы маральны закон. Нездарма Арыстоцель гаварыў, што «... да сяброў трэба адносіцца так, як бы мы хацелі, каб яны ставіліся да нас» [3, с. 31]. У прадмове да трактата «Пра дружбу» асветнік аналізуе вытокі і аснову сяброўства, называе яго вялікай дабрачыннасцю. Ён не толькі захапляецца сяброўствам, але і перасцерагае ад зайздрасці таварышаў, якая бывае мацней за нянавісць ворагаў, падкрэслівае, што сябар найлепш пазнаецца ў няшчасці, у жыццёвых выпрабаваннях; заклікае праяўляць лепшыя душэўныя якасці не праз абстрактнае чалавекалюбства, а праз увагу, спагаду і цярпенне да тых, хто знаходзіцца побач, да добрых учынкаў паводле ўнутраных перакананняў, а не напаказ. «Некаторыя, зрабіўшы чалавеку дабро, кожнаму аб гэтым расказваюць, а часам і выгаворваюць, і тым самым зводзяць на нішто свой добры ўчынак» [3, с. 135], — піша Б.Будны.

Паказчыкам, індыкатарам развіцця грамадства, на думку асветніка, з'яўляюцца адносіны да старасці. «Толькі недалёкі чалавек можа смяяцца над старасцю, не разумеючы, што ён сам да яе імкнецца» [5, с. 49], — зазначае Б.Будны. Аўтар сурова асуджае раўнадушша да састарэлых бацькоў, а таксама настаўнікаў. Ён нагадвае, што ў старажытнай Спарце неслі пакаранне за няўвагу да сталых людзей. Вопыт старэйшых шырока выкарыстоўваўся ў справах выхавання. Гэта адпавядае і славянскай традыцыі, але не заўсёды выконваецца. Таму беларускі асветнік палічыў патрэбным нагадаць суайчыннікам выпадак з афінскай рачаіснасці, дзе словы і справы таксама нярэдка разыходзіліся. Так, у час спектакля стары не мог знайсці месца ў тэатры — і афіняне смяяліся з гэтага. Як роўнага прынялі і пасадзілі яго побач паслы лакедамонскія, прадэманстраваўшы паважлівыя адносіны да старасці.

Богі Алімпа любілі шчаслівых падданых: мудрых, справядлівых, дасціпных. Гэтыя рысы народнага характару былі ў пэўнай ступені дэфармаваны сярэднявеччам, але запатрабаваны эпохай Адраджэння. Аптымізм уласцівы і светапогляду беларускага асветніка Беняша Буднага, а таксама галоўнай кнізе яго жыцця — «Кароткія і ясныя аповесці, якія па-грэчаску называюцца Апафегматамі». Яна прасякнута верай у свой народ, у пабудову справядлівага грамадства на землях айчыны з дапамогай асветы і выхавання, глыбокага ўспрыняцця і асэнсавання кожным агульначалавечых маральных каштоўнасцей, арыентавана на дыялог культур і традыцый.

1. *Будны Беняш* // Энцыклапедычны даведнік. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. — Мн., 1995. — С. 186—188.
2. *Анушкін А.* Лёс аднае кнігі // Полымя. — 1969. — № 9. — С. 247—252.
3. *Будный Б.* Собраніе нравоучительных, краткихъ и замысловатыхъ ръчей въ трехъ частяхъ. — М., 1788. — 270 с.
4. *Анушкин А.* На заре книгопечатания в Литве. — Вильнюс, 1970. — С. 91—97.
5. *Подокшин С.* Философско-этические опыты Беняша Будного // Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии. — Мн., 1977. — С. 36—51.
6. *Порецкий Я., Пренская Ю.* «Апофегматы» Беняша Будного // Нёман. — 1970. — № 11. — С. 178—181.